Утрата территорий, на которых с начала вторжения в Беларусь оккупанты были полновластными хозяевами, влияния на определенные группы населения, потери в людском составе, оружии, технике, дискомфортное состояние войск - таковы показатели результативности партизанской войны, зафиксированные в штабах германского вермахта.

Самоотверженная борьба с врагом, взаимодействие с войсками Советской Армии, крепнущее взаимопонимание с населением оккупированных территорий, - эти и другие факты партизанской войны стали достойным вкладом в Победу в Великой Отечественной войне.

1 См.: Нордман Э. Партизаны приближали Победу//Советская Белоруссия. 2005. 8 февр.
2 См.: НА РБ. Ф. 4. Д. 25. Л. 118-119.
3 НА РБ. Там же. Д. 29. Л. 98-102.
4 НА РБ. Там же. Д. 83. Л. 32-24.
5 НА РБ. Там же. Д. 33. Л. 107-109.
6 См.: НА РБ. Там же. Д. 33. Л. 85-86.
7 НА РБ. Там же. Д. 33. Л. 151-161.
8 См.: НА РБ. Там же. Д. 557. Л. 9.

Поступила в редакцию 13.04.05.

***Владимир Константинович Коршук*** - доктор исторических наук, профессор кафедры истории Беларуси нового и новейшего времени.

*Д.Ю. БАСТУН*

# КАНФЕСІЙНЫЯ ПЫТАННІ Ў ПАЛІТЫЦЫ НЯМЕЦКІХ АКУПАЦЫЙНЫХ УЛАД НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (1941-1944)

Рассматривается процесс развития христианских конфессий на территории Беларуси в годы Второй мировой войны. Затрагиваются аспекты, связанные с взаимоотношениями немецких оккупационных властей и религиозных организаций, раскрывается политика оккупантов по отношению к различным конфессиям.

The article is devoted to the problem of development of Christian faiths on the territory of Belarus in the Second World War. The article considers the aspects of relations between German occupational authorities and the religious organizations. The policy of invaders in relation to various faiths is revealed.

Перыяд Другой сусветнай вайны быў складаным і супярэчлівым часам дпя ўсіх рэлігійных арганізацый, якія знаходзіліся на тэрыторыі Беларусі. Палітыка акупацыйнага рэжыму адносна рэлігійнага пытання на захопленых тэрыторыях займала не апошняе месца. Гітлераўскі рэжым імкнуўся выкарыстаць існуючыя рэлігійныя арганізацыі для ўсталявання поўнага кантролю над насельніцтвам акупаваных тэрыторый. З гэтай мэтай была выпрацавана асобная рэлігійная палітыка.

Трапіўшая пад кантроль нямецкіх войск, Беларусь вызначалася стракатасцю канфесійнай структуры ў сувязі з тым, што частка тэрыторыі краіны да верасня 1939 г. знаходзілася ў складзе Рэчы Паспалітай і БССР, дзе ўмовы існавання і ўрадавая палітыка адносна рэлігійных суполак карэнным чынам розніліся. Становішча канфесій змянілася пасля ўваходжання Заходняй Беларусі ў склад БССР.

Народны сход 28-30 кастрычніка 1939 г. абвясціў савецкую ўладу ў Заходняй Беларусі і дэкляраваў распаўсюджванне на дадзенай тэрыторыі ўсіх законаў СССР, у тым ліку і аб рэлігійных культах. Такім чынам, на тэрыторыі ўсёй Беларусі пачало дзейнічаць аднолькавае заканадаўства, рэгламентуючае дзейнасць рэлігійных арганізацый. Аднак палітыка савецкай улады ў дачыненні да цэркваў Заходняй Беларусі мела і свае асаблівасці. Гэта было выкпікана, па-першае, параўнальна большым аўтарытэтам царквы і ўплывам яе на насельніцтва Заходняй Беларусі; па-другое, спробай савецкай улады прадэманстраваць ажыццяўленне дэмакратычнага прынцыпу свабоды сумлення ў СССР; па-трэцяе, недахопам кадраў, якія б здолелі весці антырэлігійную барацьбу і ажыццяўляць кантроль над рэлігійным жыццём грамадства ў той ступені, як гэта было на тэрыторыі Усходняй Беларусі.

Адзначаныя моманты і вызначылі той факт, што ў Заходняй Беларусі не былі створаны суполкі "Саюза ваяўнічых бязбожнікаў", які актыўна дзейнічаў на ас-

татняй тэрыторыі Беларусі[1]. Нізкі ўзровень антырэлігійнай прапаганды, кадравыя праблемы, зняважанне пачуццяў вернікаў адзначаліся ў Пастанове ЦК КП(б)Б "Аб стане антырэлігійнай прапаганды ў заходніх абласцях Беларусі". Прапаноўвалася арганізаваць правядзенне лекцый, выданне спецыяльнай літаратуры для пераадолення гэтых з'яў[2]. Толькі з сакавіка па жнівень 1940 г. на дадзенай тэрыторыі было прачытана 342 лекцыі на атэістычныя тэмы. Спецыяльна для заходніх абласцей пачалося выданне масавай антырэлігійнай літаратуры, арганізоўваліся атэістычныя радыёперадачы.

Працэс усталявання кантролю дзяржавы над рэлігійным жыццём быў спынены пачаткам Вялікай Айчыннай вайны. Захапіўшы тэрыторыю Беларусі і ўсталяваўшы на ёй акупацыйны рэжым, нямецкія ўлады сталі ажыццяўляць кантроль і над рэлігійнай дзейнасцю насельніцтва ў рамках "новага парадку" - сістэмы палітычных, эканамічных і ваенных мер, накіраваных на ліквідацыю савецкага ладу, эксплуатацыю нацыянальных багаццяў і рэсурсаў; знішчэння насельніцтва захопленай тэрыторыі. Гэта быў час цяжкіх выпрабаванняў для ўсяго беларускага народа незалежна ад нацыянальнай ці канфесійнай прыналежнасці.

Палітыка знішчэння і рабавання, якую здзяйсняў акупацыйны рэжым, супярэчыла асноўным хрысціянскім каштоўнасцям. Адмаўляя хрысціянскі светапогляд, абраднасць, традыцыі, нацысты мелі на мэце стварэнне свайго, палітызаванага варыянта царквы. У сакрэтнай дырэктыве ад 9 чэрвеня 1941 г., накіраванай абласным арганізацыям партыі, рэйхсляйтэр Борман падкрэсліваў: "Нацыянальны сацыялізм і хрысціянскія погляды несумяшчальны. Хрысціянскія цэрквы заснаваны на чалавечым невуцтве і імкнуцца замацаваць гэтае невуцтва сярод большай часткі чалавецтва, бо толькі такім шляхам хрысціянскія цэрквы здольны захаваць сваю ўладу"[3]. (Тут і далей пераклад аўтара. *- Д. Б.)*

Праводзячы палітыку вынішчэння беларускага народа, акупацыйныя ўлады былі ў той жа час зацікаўлены ў павелічэнні ролі царквы і рэлігіі. Гэта было выклікана, па-першае, жаданнем акупацыйных улад атрымаць падтрымку насельніцтва; па-другое, выкарыстаць лаяльнасць да любой улады, якую спавядалі прадстаўнікі хрысціянскіх канфесій.

Прывядзём асноўныя прынцыпы нямецкай акупацыйнай палітыкі ў дачыненні да рэлігійных арганізацый, сфармуляваныя А. Розенбергам у звароце да рэйхскамісарыятаў Остланда і Украіны ад 13 мая 1942 г.: 1. Рэлігійным групам катэгарычна забаранялася займацца палітыкай. 2. Рэлігійныя групы павінны былі быць падзелены па прыкметам нацыянальным і тэрытарыяльным. Пры гэтым нацыянальная прыкмета павінна захоўвацца найбольш дакладна пры падборы рэлігійных груп. Тэрытарыяльна ж рэлігійныя аб'яднанні не павінны выходзіць за межы адной епархіі. 3. Рэлігійныя суполкі не павінны перашкаджаць дзейнасці акупацыйных улад. 4. Асаблівая насцярожанасць рэкамендавалася ў адносінах да Рускай Праваслаўнай царквы як носьбіта варожай Германіі рускай ідэалогіі[4].

Хрысціянства на Беларусі ў часы Другой сусветнай вайны было прадстаўлена асноўнымі хрысціянскімі канфесіямі (каталіцкай, праваслаўнай і пратэстанцкай), адносна якіх палітыка акупацыйных улад мела свае асаблівасці: так, у дачыненні да каталіцкага касцёла гітлераўцы зыходзілі з таго, што ён "...патрабуе да сябе пільнай увагі... трэба дзейнічаць тым жа чынам, што і ў дачыненні да евангеліцкай царквы, гэта значыць па магчымасці пакінуць яе самой сябе. Але там, дзе яна выходзіць за межы рэлігійнага абслугоўвання вернікаў, гэта значыць займаецца місіянерскай дзейнасцю сярод вернікаў іншага веравызнання, асабліва артадаксальных вернікаў, такая дзейнасць без выключэння павінна быць забаронена". Не мяняючы сваіх адносін да царквы, гітлераўцы сцвярджалі: "На Усходзе не павінна панаваць рыма-каталіцкая царква", і высновa рабілася дакладная: "...каталіцкая царква тут павінна быць стрымана, а праваслаўнай здзяйсняць падтрымку"[5].

Канфесіі, што існавалі на акупаванай тэрыторыі, паўсталі перад складаным выбарам супрацоўніцтва ці адмаўлення прызнання нямецкага рэжыму. Большасць рэлігійных арганізацый імкнулася застацца па-за палітыкай, кіруючыся прынцыпам "Богу - Боскае, а Кесару - кесарава". Аднак у большасці выпадкаў гэта стала немагчымым. Для дазволу дзейнасці царквы на тэрыторыі, акупаванай нямецкімі войскамі, было неабходна прайсці працэдуру рэгістрацыі, да якой

дапушчаліся толькі суполкі, выказаўшыя сваю падтрымку нямецкаму рэжыму і згоду з праводзімай ім рэлігійнай палітыкай. Тыя ж арганізацыі, якія не прызналі акупацыйны рэжым, пазбаўляліся права дзейнічаць на тэрыторыі Беларусі і падвяргаліся рэпрэсіям.

Рэлігійнае жыццё было ў значнай ступені абмежавана: цэрквам забаранялася праводзіць службы па-за царкоўнымі будынкамі без спецыяльнага дазволу ўлад, збіраць ахвяраванні, навучаць рэлігіі ў школах, выпускаць свае перыядычныя выданні, праводзіць царкоўныя кангрэсы і ім падобныя арганізацыйныя мерапрыемствы, забаранялася палітычная дзейнасць святароў і канфесійных саюзаў. Паводле ўказа акупацыйнай улады ад 13 верасня 1941 г. "Аб саюзах і таварыствах рэлігійных", царква набывала статус юрыдычнай асобы[6]. Рэалізацыя рэлігійнай палітыкі мела вынікам тое, што цэрквы на тэрыторыі Беларусі страчвалі свой грамадска-прававы статус і ставіліся акупацыйнымі ўладамі ў шэраг звычайных арганізацый, якія былі пад пільным кантролем акупацыйнай улады і кіраваліся зыходзячымі ад іх палажэннямі. Такім чынам, дзейнасць царкоўных арганізацый абмяжоўвалася выключна духоўнай без права ўмешвання ў палітыку.

Метады ўздзеяння на рэлігійнае жыццё акупаваных тэрыторый былі рознымі - ад рассылкі цыркуляраў да фізічнага знішчэння нязгодных. Праводзячы палітыку абмежавання дзейнасці цэркваў, нямецкія ўлады стваралі ўражанне ўдзелу царкоўных арганізацый у вырашэнні свайго лёсу. Так, праваслаўная царква ў Беларусі мела магчымасць правесці сабор па абвяшчэнню аўтакефаліі, які прайшоў у Мінску 2 верасня 1942 г. Праваслаўная царква не мела перашкод з боку ўлад у справе наладжвання ўнутрыцаркоўнага духоўнага жыцця; ствараліся новыя прыходы; аднавіліся набажэнствы ў Сафійскім саборы, якія працягваліся да лета 1944 г. У 1943 г. у Мінску распачаў дзейнасць Свята-Духаў мужчынскі манастыр. Адкрываліся не толькo раней працаваўшыя цэрквы. У некоторых мясцінах удавалася ўзвесці новыя храмы[7].

У больш складаных умовах на акупаванай тэрыторыі Беларусі апынулася каталіцкая царква. У рэлігійнай палітыцы нямецкі ўрад аддаваў перавагу праваслаўнай царкве перад каталіцкай і нярэдкія спрэчкі між імі вырашаў на карысць праваслаўнай царквы. Так, напрыклад, ліквідаваліся польскія школы, у якіх ішло навучанне асновам каталіцызму, замест іх адчыняліся беларускія, заснаваныя на праваслаўным навучанні. Ажыўленне рэлігійнага жыцця, якое назіралася ў пачатку акупацыі і характарызавалася аднаўленнем дзейнасці касцёлаў і павелічэннем колькасці хрышчэнняў, да 1943-1944 гг. ператварылася ў сваю супрацьлегласць. Так, у Гродне, дзе да ліпеня 1943 г. дзейнічалі пяць касцёлаў, да канца акупацыі застаўся толькі адзін [8].

Нямецкімі акупацыйнымі ўладамі былі прыняты крокі па актывізацыі дзейнасці уніяцкіх абшчын. У пачатку 1942 г. экзархат уніяцкай царквы дабіўся свайго афіцыйнага прызнання і дазволу на легальную дзейнасць. Рада экзархата была ўтворана 2 мая, а на наступны дзень - Духоўны суд. Гэта спрыяла часоваму ажыўленню уніяцкага жыцця.

Акупацыйныя ўлады садзейнічалі актывізацыі пратэстанцкага руху, не ўмешваліся ва ўнутранае жыццё абшчын, не перашкаджалі адкрыццю малітоўных дамоў і дзейнасці новых суполак, што дазволіла значна павялічыць колькасць абшчын евангельскіх хрысціян і баптыстаў за гады вайны. Толькі ў Мінскай вобласці ў 1941-1942 гг. службы пачалі праходзіць у 7 абшчынах. Пачалі дзейнічаць малітоўныя дамы ў Оршы, Дуброўне, вёсцы Грышаны Віцебскай вобласі, абшчыны ў Гомельскай, Магілёўскай і іншых абласцях. У Слуцку толькі ў 1943 г. хрышчэнне прыняло 300 чалавек[9]; у Мінскай абшчыне за гады акупацыі - больш за 100 чалавек; у Прусінскай абшчыне Уздзенскага раёна - больш за 50[10]. Абшчыны дзейнічалі легальна: у чэрвені 1944 г. пры дазволе акупацыйных улад у Мінску была склікана канферэнцыя Евангельскіх хрысціян-баптыстаў (ЕХБ), на якой прысутнічалі прадстаўнікі з усёй тэрыторыі Беларусі. Праграмай канферэнцыі было прадугледжана "...правядзенне духоўна-евангелізацыйнай работы сярод насельніцтва Беларусі ва ўмовах акупацыі"[11].

У кастрычніку 1941 г. беларускія пяцідзесятнікі на сваім з'ездзе выказалі падзяку Богу за новую ўладу. З'езд пастанавіў атрымаць дазвол аб прызнанні

рэлігійна-адміністрацыйнага цэнтра Хрысціян веры евангельскай (ХВЕ). У выніку перамоў немцы дазволілі дзейнасць ХВЕ[1] а кіраўніцтва царквы згадзілася прызнаць акупацыйны рэжым і абавязалася ўтрымлівацца ад палітычнай барацьбы. Нягледзячы на заяву кіраўніцтва ХВЕ аб сваёй лаяльнасці Германіі, акупацыйныя ўлады не мелі даверу да пяцідзесятнікаў. Напрыкпад, адзін з арганізатараў пяцідзесятніцкага руху ў Заходняй Беларусі ў 1924-1939 гг. С. Нядведскі быў арыштаваны немцамі і расстраляны. Прычынай сталі выказванні, у якіх С. Нядведскі неаднаразова называў акупацыйны рэжым у Беларусі "часовай з'явай"[12].

Калі параўноўваць становішча пратэстанцкіх цэркваў у ІІ Рэчы Паспалітай з іх прававым становішчам пры акупацыйным рэжыме Германіі, то трэба зазначыць узмацненне дзяржаўнага кантролю над дзейнасцю і ўнутраным жыццём пратэстанцкіх цэркваў. Аднак для беларускіх пратэстантаў нямецкая палітыка ў рэлігійным пытанні прынесла значную палёгку. Па-першае, пратэстанцкія абшчыны на тэрыторыі Беларусі не былі прызнаны і зарэгістраваны ўладамі ІІ Рэчы Паспалітай, таму іх дзейнасць да 1939 г. мела абмежаваны характар і строга рэгламентавалася дзяржавай. Пасля падзей верасня 1939 г. і само іх існаванне на тэрыторыі Заходняй Беларусі было пастаўлена пад пагрозу знішчэння, бо, на думку ўлад, яны ўяўлялі сабой пагрозу існуючаму ў грамадстве ладу. Акупацыя Беларусі нямецкімі войскамі і праводзімая імі палітыка ў дачыненні да рэлігійных суполак успрымаліся беларускімі пратэстантамі як вырataванне ад поўнага знішчэння.

Адносіны нямецкіх акупацыйных улад да рэлігійных арганізацый на тэрыторыі Беларусі характарызаваліся пільным кантролем і ўмяшальніцтвам у царкоўную палітыку. Царква як грамадскі інстытут не з'яўлялася самастойнай у гады акупацыі. Знаходзячыся пад сталым кантролем нямецкіх улад і беларускіх калабарантаў, праваслаўны, каталіцкі і пратэстанцкі клір быў уцягнуты ў палітыку, што з'яўлялася парушэннем самога разумення царкоўнай арганізацыі. Нягледзячы на істотнае абмежаванне сферы дзейнасці рэлігійных арганізацый, перыяд 1941-1944 гг. характарызаваўся ажыўленнем рэлігійнага жыцця на акупаваных Германіяй тэрыторыях. Адкрыццё храмаў, лаяльнасць улад да царквы выклікалі хуткі рост колькасці вернікаў і павелічэнне аўтарытэту рэлігіі.

Пасля вызвалення Беларусі ад акупацыйнага рэжыму рэлігійная палітыка савецкай улады пацярпела некаторыя змены. Новая геапалітычная сітуацыя ў Еўропе пасля вайны патрабавала ад савецкага кіраўніцтва выкарыстання ўсіх магчымых сродкаў для ўзмацнення свайго ўплыву на міжнароднай арэне. Выкарыстоўваўся і рэлігійны фактар. Рэлігійным організацыям дазвалялася ствараць новыя абшчыны, не перашкаджалася аграніз оўваць новыя структуры, дапушчалася стварэнне легальных перыядычных органаў буйных хрысціянскіх цэркваў. У гады вайны спыніліся рэпрэсіі супраць духавенства, улады давалі дазвол на адчыненне новых храмаў. З 1943 г. на неакупаванай тэрыторыі Савецкага Саюза пачалася рэгістрацыя рэлігійных агранізацый, адчыняліся цэрквы і малітоўныя дамы, узнавілі сваю дзейнасць некаторыя духоўныя вучэбныя ўстановы. Для ўсталявання кантакту паміж дзяржаўнымі органамі і рэлігійнымі арганізацыямі пры Савеце Народных Камісараў СССР у верасні 1943 г. быў створаны Савет па справах Рускай Праваслаўнай царквы, а ў 1944 г. - Савет па справах рэлігійных культаў.

Дзейнасць рэлігійных арганізацый на тэрыторыі акупаванай Беларусі, з аднаго боку, была часам цяжкіх выпрабаванняў і барацьбы за сваё існаванне. З іншага боку, ажыўленне рэлігійнага руху падчас Другой сусветнай вайны дало магчымасць для далейшага развіцця канфесій на Беларусі і аказала ўплыў на змяненне палітыкі савецкай улады ў адносінах да набраўшага моц рэлігійнага руху.

[1] Гл.: Онищук Н.П. Деятельность Союза воинствующих безбожников в Западной Беларуси в 1939-1941 гг. // Чалавек. Этнас. Тэрыторыя. Праблемы развіцця заходняга рэгёна Беларусі: Матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. Брэст, 1998. С. 197.

[3] Ярмусик Э.С. Католический Костел в Беларуси в годы Второй мировой войны (1939-1945). Гродно, 2002. С. 66.

[4] Гл.: Силова С.В. Нацистский оккупационный режим и православная церковь в Беларуси в 1941-1944 гг. // Германский и славянский миры: взаимовлияние, конфликты, диалог культур (история, уроки, опыт, современность): Материалы Междунар. науч.-теорет. конф., 6-8 дек. 2001 г. Витебск, 2001. С. 157.

5 Ярмусик Э.С. Указ. тв. С. 72.
6 Гл.: Bartel O. Protestantyzm w Polsce. Warszawa, 1963. С. 33.
7 Канфесіі на Беларусі (к. XVII-XX ст.) / В.В. Грыгор'ева, У.М. Завалюнюк, У.І. Навіцкі, А.М. Філатава; навук. рэд. У.І. Навіцкі. МН., 1998.
8 Гл.: Ярмусик Э. С. Указ. тв. С. 87.
9 Гл.: История евангельского движения в Беларуси // Крыніца жыцця. 1998. № 3. С. 17.
10 Гл.: Баптизм и баптисты (Социологический очерк) І Ред. М.Я. Пенсу, Е.С. Прокошина. МН., 1969. С. 33.
11 История евангельского движения в Беларуси *II* Крыніца жыцця. 1998. № 2. С. 32.
12 Гл.: Дьяченко О.В. Миссионерская деятельность пятидесятнической церкви в Беларуси. Могилев, 1999. С. 35.

Паступіў у рэдакцыю 05.04.05.

***Дар'я Юр'еўна Бастун*** - аспірантка кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу. Навуковы кіраўнік- кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры А.Г. Каханоўскі.

*А. Б. ЕЛИСЕЕВ, В. И. МЕНЬКОВСКИЙ*

# РУССКАЯ ПРАВОСЛАВНАЯ ЦЕРКОВЬ В ГОДЫ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ: ИСТОРИОГРАФИЧЕСКИЕ АСПЕКТЫ

Анализируются различные аспекты русскоязычной историографии Русской Православной церкви в годы Великой Отечественной войны, раскрываются особенности альтернативных подходов к освещению этой проблемы в советской историографии, исследованиях авторов русского зарубежья и современных историков.

The article gives the analysis of different aspects of the Russian historiography of the Russian Orthodox Church during the period of the Great Patriotic war. The authors consider the characteristic features of various approaches in elucidating this problem in the Soviet historiography, in the publications of the Russian foreign authors and contemporary historians.

В годы Великой Отечественной войны во всех слоях населения Советского Союза обострился гражданский и нравственный выбор. В первый же день войны с патриотическим призывом к верующим обратилась Русская Православная церковь (РПЦ). В послании Патриаршего Местоблюстителя митрополита Сергия (Страгородского) 22 июня 1941 г. говорилось: «Фашиствующие разбойники напали на нашу родину... Православная наша церковь всегда разделяла судьбу народа. Не оставит она народа своего и теперь. Благословляет она небесным благословением и предстоящий всенародный подвиг»[1].

Как объект исторического исследования деятельность Русской Православной церкви в годы Великой Отечественной войны начинает рассматриваться во второй половине 40-х - первой половине 50-х гг. XX в. С этого времени формируются два подхода к изучению истории РПЦ военного периода, представленные советской историографией и историографией русского зарубежья. Вплоть до второй половины 1980-х гг. исторические дискуссии вокруг роли Московского Патриархата в годы войны характеризуются именно их противостоянием.

В рамках советской исторической науки можно выделить работы светских и православных авторов. Несмотря на это, нет оснований говорить о двух историографических направлениях, так как для тех и других характерен единый подход к общей оценке государственно-церковных отношений в СССР: только после отделения церкви от государства в 1918 г. Русская Православная церковь приобрела наиболее благоприятные условия для свободного существования за всю свою историю. Разумеется, православные историки и богословы не разделяли официально общепринятого положения о вреде религии и необходимости преодоления ее влияния на общество.

Основное внимание советских исследований было сосредоточено на патриотической позиции церкви в годы войны как центральном факторе, повлиявшем на нормализацию отношений православной церкви с Советским государством. Термин «нормализация» широко использовался в советской науке для характеристики указанных процессов[2]. Ряд авторов рассматривали патриотизм Русской Православной церкви в годы Великой Отечественной войны в качестве вынужденного шага. А.И. Барменков, В.В. Колобков, Ф.М. Придувалов, напри-